КАНФЕРЭНЦЫЯ
НОВАЯ
БЕЛАРУСЬ

# [ ПРАЕКТ ]
# Дэкларацыя аб неабходнасці вызвалення і падтрымкі палітвязняў

[ Канферэнцыя Новая Беларусь 03-04 Жніўня 2024 ]

Мы, прадстаўнікі беларускіх дэмакратычных сілаў, заяўляем, што вызваленне беларускіх палітвязняў з'яўляецца для нас ключавым прыярытэтам.

Злачынны і нелегітымны рэжым Лукашэнкі праводзіць палітыку сістэматычных масавых рэпрэсіяў супраць грамадзянаў Рэспублікі Беларусь. Тысячы беларусаў і беларусак сёння знаходзяцца за кратамі па палітычных прычынах, дзясяткі тысячаў прайшлі праз досвед рэпрэсіяў, сотні тысячаў іх блізкіх і сваякоў праходзяць праз пакуты і страх. Усе гэтыя людзі патрабуюць дапамогі.

- Мы патрабуем спынення ўсіх відаў рэпрэсіяў і вызвалення палітзняволеных. Вызваленне кожнага – важнае, вызваленне палітзняволеных па гуманітарным спісе – неадкладнае, вызваленне абсалютна ўсіх – канчатковая мэта, да дасягнення якой нельга спыняцца;
- Мы рашуча асуджаем і патрабуем спыніць практыку інкамунікада, калі людзей за кратамі трымаюць у поўнай ізаляцыі ад знешняга свету, і даць доступ да зняволеных;
- Мы імкнемся аб'яднаць усе намаганні па вызваленні палітвязняў і спыненню рэпрэсіяў у Беларусі, выкарыстоўваючы ўсе неабходныя інструменты;
- Мы не адмаўляем выкарыстанне самых розных шляхоў: санкцыйны і дыпламатычны ціск на рэжым, працу па гуманітарным спісе і гуманітарныя перамовы;
- Мы падымаем і надалей будзем падымаць пытанне палітвязняў на ўсіх магчымых пляцоўках і фарматах, з беларусамі і замежнікамі;
- Мы заклікаем усіх да падтрымкі рэпрэсаваных. Любы крок важны: ліст палітвязню, дапамога сваякам палітзняволеных, данат фондам салідарнасці, вулічная акцыя, мастацкі твор і іншыя дзеянні, якія прыцягваюць увагу да беларускіх палітзняволеных;
- Мы заклікаем міжнародныя арганізацыі і асабіста неабыякавых людзей па ўсім свеце падтрымаць нашыя намаганні па вызваленні беларускіх палітвязняў.

Свабоду палітвязням!